XXII Нядзеля звычайная

Аўтар: кс. Павел Салабуда
30.08.2015 01:00



З Евангелля св. Марка

Сышліся разам да Езуса фарысеі і некаторыя з кніжнікаў, якія прыйшлі з Ерузалема. І ўбачылі, што некаторыя вучні Ягоныя елі хлеб нячыстымі, гэта значыць, неабмытымі рукамі. Фарысеі ж і ўсе юдэі, трымаючыся традыцыі старэйшых, не ядуць, пакуль старанна не памыюць рук. І вярнуўшыся з рынку, не ядуць, пакуль не абмыюцца. Ёсць і яшчэ шмат таго, чаго прынята трымацца: абмыцця кубкаў, і збаноў, і місаў, і лавак. Тады пытаюцца ў Яго фарысеі і кніжнікі: “Чаму вучні Твае не трымаюцца традыцыі старэйшых, але ядуць хлеб нячыстымі рукамі?”. Ён адказаў ім: “Добра прарочыў Ісая наконт вас, крывадушных, як напісана: «Народ гэты шануе Мяне вуснамі, а сэрцы іх далёка ад Мяне. Але марна пакланяюцца Мне, навучаючы вучэнню чалавечых запаведзяў». Бо вы пакінулі запаведзь Божую, а трымаецеся чалавечай традыцыі”. Потым зноў паклікаў народ і сказаў яму: “Слухайце Мяне ўсе і разумейце. Няма нічога, што магло б, уваходзячы звонку ў чалавека, зрабіць яго нячыстым, але тое робіць чалавека нячыстым, што выходзіць з яго. Бо знутры, з чалавечага сэрца, выходзяць благія думкі, распуста, крадзеж, забойствы, зайздрасць, чужалоства, сквапнасць, зласлівасць, падступнасць, бессаромнасць, блюзнерства, пыха, глупства. Усё гэтае зло знутры выходзіць і робіць чалавека нячыстым”. †

Мк 7, 1–8. 14–15. 21–23

Мы ў школе Езуса

Існуе Хтосьці, хто вучыць нас, як трэба дзейнічаць, як уваходзіць у чарговыя этапы зразумення і чысціні, прытым не толькі цялеснай, але, галоўным чынам, належнай – духоўнай. Гэта наш Пан Езус Хрыстус, які кажа нам: “Слухайце Мяне ўсе і разумейце. Няма нічога, што магло б, уваходзячы звонку ў чалавека, зрабіць яго нячыстым, але тое робіць чалавека нячыстым, што выходзіць з яго. (...) Бо знутры, з чалавечага сэрца, выходзяць благія думкі, распуста, крадзеж, забойствы, зайздрасць, чужалоства, сквапнасць, зласлівасць, падступнасць, бессаромнасць, блюзнерства, пыха, глупства. Усё гэтае зло знутры выходзіць і робіць чалавека нячыстым” (Мк 7, 14–15. 21–23). Застаецца толькі пытанне: як паступаць, каб жыць згодна з навучаннем. Але гэта залежыць толькі і выключна ад нашага сумлення і разумення Божага слова.